**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ГАРАЧЫ ЭДУАРД МІКАЛАЕВІЧ

**АКЦЁР, ЗАСЛУЖАНЫ АРТЫСТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**НАР. 19 КАСТРЫЧНІКА 1936 г.**

**ФОНД № 424**

**ВОПІС № 1**

**1945 – 1990 гг.**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 424**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| 0. | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Э.М. ГАРАЧАГА | 1-30 | 1-5 |
| 1.1. | ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА (ТЮГ БССР), МАГІЛЁЎСКАГА АБЛАСНОГА ДРАМТЭАТРА | 2-5 | 2 |
| 1.2. | ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА | 6-21 | 1-4 |
| 1.3. | ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З ТЭЛЕСПЕКТАКЛЯЎ | 22-24 | 4 |
| 1.4. | ФАТАГРАФІІ КАДРАЎ З МАСТАЦКІХ ФІЛЬМАЎ, КІНАПРОБ З УДЗЕЛАМ Э.М. ГАРАЧАГА | 25-30 | 4-5 |
| 2. | ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ Э.М. ГАРАЧАМУ АД РОЗНЫХ АСОБ | 31-33 | 5-6 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І ПРА Э.М. ГАРАЧАГА | 34-39 | 6 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 40-62 | 7-9 |
| 4.1. | ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І З ДЗЕЯЧАМІ КУЛЬТУРЫ | 40-50 | 7-8 |
| 4.2. | ФАТАГРАФІІ АКЦЁРАЎ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА І ІНШ. | 51-62 | 8-9 |

## Прадмова

**Гарачы Эдуард Мікалаевіч** нарадзіўся 19 кастрычніка 1936 г. у г. Мінску. З 1941 г. да 1945 г. жыў у г. Яраслаўлі, там жа ў 1944 г. пайшоў у першы клас. У 1945 г. зноў вярнуўся ў г. Мінск. Вучыўся ў 60-й чыгуначнай мужчынскай школе г. Мінска (1945-1954), Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) (курс Д.А. Арлова) (1954-1958). З 1958 г. да 1962 г. працаваў у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача (ТЮГ БССР). У 1962 г. арыштаваны за “антысавецкую агітацыю” і асуджаны на 2 гады ў Папраўча-працоўны лагер (ППЛ). Пакаранне адбываў у ППЛ Дубравлага Мардоўскай ССР (п. Поцьма), у 1983 г. быў рэабілітаваны. Пасля працаваў у Магілёўскім абласным драмтэатры (1964-1965), Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага (цяпер Нацыянальны акадэмічны драмтэатр імя М. Горкага) (з 1965), выкладчыкам у народным тэатры Палаца культуры Мінскага трактарнага завода (з 1965).

Вядомыя акцёрскія работы ў ТЮГ БССР: Міця (“Няроўны бой” В.С. Розава, 1960), Федзька Лукашоў (“Учора ў Касаткіне” А.Р. Зака і І.К. Кузняцова, 1959); у Магілёўскім абласным драматэатры: Аляксей Токараў (“Рассудзіце нас, людзі” паводле А. Андрэева, 1964), Збышка (“Мараль пані Дульскай” Г. Запольскай, 1964), Мікеле (“Філумена Мартурана” Э.Дэ Філіпа, 1964); у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага: Пікалаў (“Любоў Яравая” К. Транёва, 1967), Конь (“Ворагі” М. Горкага, 1970), Хрыстафор Блахін (“Казкі старога Арбата” А.М. Арбузава, 1971), Рос (“Макбет” У. Шэкспіра, 1974), Гайшун (“Вяртанне ў Хатынь” А. Адамовіча, Б.І. Луцэнкі, 1977), Ілья (“Апошні тэрмін” паводле В. Распуціна, 1980), Фірс (“Вішнёвы сад” А. Чэхава, 1981), Ігнат Крывіч (“Соль” А. Петрашкевіча, 1981), Вінаградаў (“Аб’ява ў вячэрняй газеце” А. Паповай, 1982), Васіль Дасцігаеў (“Ягор Булычоў і іншыя”, М. Горкага, 1982), Энгстран (“Здані” Х. Ібсена, 1983), Гарацыо (“Гамлет”, 1984, У. Шэкуспіра), Лявон (“Знак бяды” паводле В.У. Быкава, 1985), Кастылёў (“На дне” М. Горкага, 1985,), Іван Афанасьеў (“Хрыстос і Антыхрыст” паводле Д. Мережкоўскага, 1991), Стары (“Альпійскае ззянне” П. Турыні, 1998). Здымаўся ў кіно, сыграў ролі ў мастацкіх фільмах кінастудыі “Беларусьфільм”: Зязюлі (“Десятая доля пути”, рэж. Ю.М. Дубравін, 1968), бацькі Генкі (“Кортик”, рэж. М.А. Калінін, 1973), Пісуліна (“Винтъ”, рэж. У. Трэцьякоў, 1975), Сямёна Данілевіча (“Третьего не дано”, рэж. І.М. Дабралюбаў, 1980), Савелія (“Затишье”, рэж. В.П. Чацверыкоў, 1981), Мікалая (“Государственная граница”, рэж. Б.М. Сцяпанаў, В.А. Нікіфараў, Г.К. Іваноў, 1980-1982,), Муж Алёны (“Конец бабьего лета”, рэж. Д.Л. Ніжнікоўская, 1983), Фларыяна (“Вяртанне ў Хатынь”, рэж. Б.І. Луцэнка, 1984), Дзяніса Зазыбы (“Плач перапёлкі”, рэж. І.М. Дабралюбаў, 1990), Івана Андрэевіча (“Эпилог”, рэж. І.М. Дабралюбаў, 1994) і інш., Фёдара Мікалаевіча (“Сынок”, рэж. А.В. Туровіч, 2007).

У 1995 г. Э.М. Гарачаму было прысвоена званне “Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь”.

Узнагароджаны: медалём “За выдающиеся заслуги в белорусском кинематографе”; ганаровай граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2016); граматамі – Вярхоўнага Савета БССР за ўдзел у Дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2011); дыпломам “За лучшую мужскую роль года” (фільм “Плач перапёлкі”).

Дакументы Э.М. Гарачага паступілі ў БДАМЛМ ад самога фондаўтваральніка ў 1992 г. У выніку НТА быў створаны вопіс № 1, сфарміравана 62 справы (172 дак.) за 1945-1990 гг.

Вопіс складаецца з 4-х раздзелаў:

У першым раздзеле “Творчыя дакументы Э.М. Гарачага” справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе. У ім змешчаны фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролях і сцэнах з спектакляў, сыграных у ТЮГ БССР, Магілёўскім абласным драмтэатры, Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага, тэлеспектакляў, кадраў і кінапроб з мастацкіх фільмаў. За 1958-1990 гг.

У другі раздзел “Дароўныя надпісы Э.М. Гарачаму ад розных асоб” увайшла невялікая колькасць дакументаў за [1954]-1972 гг.

У трэцім раздзеле “Дакументы да біяграфіі і пра Э.М. Гарачага” справы сістэматызаваны па храналагічным прынцыпе за 1954-1958, 1974-1977 гг.

У чацвёртым раздзеле “Выяўленчыя дакументы” справы сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе. У ім змешчаны: шаржы, партрэты, фотапартрэты Э.М. Гарачага, фатаграфіі Э.М. Гарачага ў групе з А.Х. Асіпенкам, Э.М. Зайцавай, Б.Л. Берцінгам, Л.С. Бельскай, А.І. Клімавай, Т.А. Кокштысам, І.К. Лакштанавай, А.Я. Фурманавай і інш.; фатаграфіі акцёраў у ролях і сцэнах з спектакляў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага. За 1945-1983 гг.

Прадмову склала
вяд.архівіст Н.П. Прынько
2021

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

_____________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ Э.М. ГАРАЧАГА** | | | | |
| 1 | У.М. Вайновіч. "Необычайные приключения солдата Чонкина" = "Жизнь и необычайные приключения солдата Ивана Чонкина". П'еса. (Роля Гладышава).<br>Друкванае выданне з паметамі [Э.М. Гарачага] | 1989 | 22 | 1 | |
| | **1.1. ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА (ТЮГ БССР), МАГІЛЁЎСКАГА АБЛАСНОГА ДРАМТЭАТРА** | | | | |
| 2 | Фатаграфія Э.М. Гарачага ў ролі Мацейкі ("Прымакі" Я. Купалы, рэж. П.С. Малчанаў), сыгранай у дыпломным спектаклі выпускнікоў акцёрскага факультэта БДТМІ | 1958 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 3 | Фатаграфія Э.М. Гарачага ў ролі Анатоля ("Сёстры" Ф. Кнорэ, рэж. А.М. Бяляеў і Г.М. Ручымскі), сыгранай у ТЮГ БССР | 1959 | 1 | 1 | |
| 4 | Фатагафіі сцэн з спектакля ТЮГ БССР "Учора ў Касаткіне" ("Два колеры") А.Р. Зона і І.К. Кузняцова, пастаўленага рэж. Л.І. Мазалеўскай, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Федзькі Лукашова), С.І. Мацюкевіч (у ролі Тамары) | 1959 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролях: [супрацоўніка НДІ] ("104 старонкі пра каханне" Э.С. Радзінскага, рэж. Б.С. Валадарскі), Мікеле ("Філумена Мартурана" Э.Дэ Філіпа, рэж. А. Асанін), сыграных у Магілёўскім абласным драмтэатры | 1964-1965 | 3 | 3 | |
| | **1.2. ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА** | | | | |
| 6 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі Адстаўнога | 1970 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | салдата Каня ("Враги" М. Горкага, рэж. А.А. Даброцін), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам Э.М. Гарачага, К.Л. Кулакова (у ролі Квача), Р.І. Янкоўскага (у ролі Якава Бардзіна) і інш. | | | | |
| 7 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Сказки старого Арбата" А.М. Арбузава, пастаўленага рэж. Ю. Міраненкам, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Хрыстафора Блахіна), В.К. Галузы (у ролі Кузьмы), К.А. Шышкіна (у ролі Баляснікава) | 1971 | 3 | 3 | |
| 8 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Алиса в стране Чудес", пастаўленага рэж. Л. Лур'е паводле казкі Л. Кэрол, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Чэшырскага Ката), А.В. Пановай (у ролі Алісы) | 1974 | 1 | 1 | |
| 9 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролях: Салдата ("Василий Тёркин" А.Т. Твардоўскага), Расэ ("Макбет" У. Шэкспіра), Акуліча ("Последняя инстанция" М.Я. Матукоўскага), Клакера ("Сладкоголосая птица юности" Т. Уільямса) (рэж. Б.І. Луцэнка) і інш., сыграных у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага | 1974-[1980-я гг.] | 6 | 6 | |
| 10 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі Анджэя ("Час пик" паводле аповесці Е. Ставінскага, рэж. А.Ф. Кац), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Э.М. Гарачага, Б.А. Масумян (у ролі Зосі), Р.І. Янкоўскага (у ролі Кшыштава Максімовіча) | 1975 | 4 | 4 | |
| 11 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Возвращение в Хатынь" А.М. Адамовіча, Б.І. Луцэнкі, пастаўленага рэж. М. Кавальчыкам, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Гайшуна), В.М. Клебановіч (у ролі Жанчыны), А.І. Клімавай (у ролі Жанчыны) | 1977 | 4 | 4 | |
| 12 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Мальер" М.А. Булгакава, пастаўленага рэж. У.А. Маланкіным, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Айца Варфаламея), А. Бялова (у ролі слугі Мальера), В.М. Філатава (у ролі Мальера) і інш. | 1978 | 3 | 3 | |
| 13 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі Мастака Лянькова ("Синие кони на красной траве" М. Шатрова, паст. | 1979 | 4 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Б.І. Луцэнкі, рэж. Д.П. Дзіджыокас), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам З.Г. Асмолавай (у ролі Надзеі Крупскай), А.А. Бялова (у ролі Хадака), В.М. Клебановіч (у ролі Сапожнікавай), Ю.Ф. Ступакова (у ролі Леніна) | | | | |
| 14 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Повесть о бездомных собаках" паводле аповесці К.К. Сергіенкі, пастаўленага рэж. М.М. Пінігіным, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Галавастага), А.П. Кармуніна (у ролі Чорнага) і інш. | 1980 | 1 | 1 | |
| 15 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Соль" А.А. Петрашкевіча, пастаўленага рэж. Б.А. Глаголіным, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Ігната Крывіча), З.В. Асмалоўскай (у ролі Анны), А.П. Аксёнавай (у ролі Ірыны) і інш. і ў час рэпетыцыі | 1981 | 3 | 3 | |
| 16 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "А по утру они проснулись" паводле аповесці В.М. Шукшына, пастаўленага рэж. І.А. Райхельгаўзам, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Нервовага), А.Б. Абуховіч (у ролі Санітаркі), В.М. Быкава (у ролі Карэспандэнта) і інш. і ў час рэпетыцыі | 1982 | 6 | 6 | |
| 17 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі Вінаградава ("Объявление в вечерней газете" А.Г. Паповай, рэж. М.М. Пінігін), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэн з гэтага спектакля з удзелам Э.М. Гарачага, І.С. Андрэева (у ролі Уладзіміра), З.В. Асмалоўскай (у ролі Маргарыты Львоўны), В.М. Бандарэнкі (у ролі Мікіты) і інш. | 1982 | 8 | 8 | |
| 18 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі сталяра Энгстрана ("Привидения" Х. Ібсэна, рэж. Д.Л. Лібуркін), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Э.М. Гарачага, А.Г. Аляшкевіч (у ролі Рэгіны) | 1983 | 2 | 2 | |
| 19 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Егор Булычов и другие" М. Горкага, пастаўленага рэж. Б.А. Глаголіным, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Дасцігаева), З.Г. Асмолавай (у ролі Лізаветы), Б.М. Падвы (у ролі Званцова), Т. Хвосцікавай (у ролі Варвары) | 1983 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 20 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Гамлет" У. Шэкспіра, пастаўленага В.В. Маслюком, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Гарацыо), А.А. Душачкіна (у ролі Марцэла), А. Франскевіча (у ролі Гамлета), У.І. Шэлестава (у ролі Озріка) | 1984 | 1 | 1 | |
| 21 | Фатаграфіі сцэн з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Знак беды" паводле аповесці В.У. Быкава, пастаўленага рэж. В.В. Маслюком, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Лявона), В.К. Галузы (у ролі Касмачова) і інш. | 1985 | 2 | 2 | |

### 1.3. ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА Ў РОЛЯХ І СЦЭНАХ З ТЭЛЕСПЕКТАКЛЯЎ

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 22 | Фатаграфіі сцэн з тэлеспектакля Рэспубліканскай студыі тэлебачання "Где тонко, там и рвётся" па п'есе І.С. Тургенева, пастаўленага рэж. М.Л. Рэхельсам, з удзелам Э.М. Гарачага, В.У. Галіны, І.М. Камарова, Т.Д. Кудраўцавай, Б.А. Масумян, В.П. Шуры і інш. | [1965-1976] | 9 | 9 | |
| 23 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага ў ролі Куторгі ("Пінская шляхта" В. Дуніна-Марцынкевіча, рэж. Г. Нікалаеў), сыгранай у тэлеспектаклі Рэспубліканскай студыі тэлебачання, і сцэн з гэтага тэлеспектакля з удзелам Э.М. Гарачага, Я.М. Лявонцьева (у ролі Ціхона Пратасавіцкага), В.З. Краўчанкі (у неўстаноўленай ролі) і інш. ў час рэпетыцый разам з рэж. Г. Нікалаевым | 1979 | 6 | 6 | |
| 24 | Фатаграфіі сцэны з тэлеспектакля Рэспубліканскай студыі тэлебачання "Млечны шлях" паводле К. Чорнага, пастаўленага рэж. Артымовічам, з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Старога немца), В.М. Філатава (у ролі Вусатага) | 1981 | 2 | 2 | |

### 1.4. ФАТАГРАФІІ КАДРАЎ З МАСТАЦКІХ ФІЛЬМАЎ, КІНАПРОБ З УДЗЕЛАМ Э.М. ГАРАЧАГА

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 25 | Фатаграфіі кадраў з мастацкага фільма рэж. Ю.М. Дубровіна "Десятая доля пути" з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Зязюлі), Б.У. Бібікава (у ролі Данілевіча), А.С. Эйбажэнкі (у ролі Паўла Караткова) і інш. "Беларусьфільм" | 1968 | 3 | 3 | |
| 26 | Фатаграфіі кінапроб Э.М. Гарачага для фільмаў: "Винтъ" (рэж. У. Траццякоў), "Конец бабьего лета" (рэж. Д.Л. Ніжнікоўская), "Паруса моего детства" | 1975-1990 | 6 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | (рэж. Л.У. Мартынюк), "Плач перепёлки" (рэж. І.М. Дабралюбаў). "Беларусьфільм" | | | | |
| 27 | Фатаграфіі кадраў з мастацкага фільма рэж. І.М. Дабралюбава "Третьего не дано" з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі Данілевіча), В.С. Белахвосціка (у ролі Каржа), П.В. Кармуніна (у ролі Яфіма) і інш. "Беларусьфільм" | 1980 | 12 | 12 | |
| 28 | Фатаграфіі кадраў з мастацкага фільма рэж. В.П. Чацверыкова "Затишье" з удзелам Э.М. Гарачага (у ролі старасты Савелія), В.А. Аляксандрава (у ролі Селяніна), В.Р. Іллічова (у ролі лакея Фядота), А.Я. Ліванава (у ролі Астахава) і інш. і кінапроба | 1981 | 3 | 3 | |
| 29 | Фатаграфія кінапробы Э.М. Гарачага з А.П. Кармуніным для мастацкага фільма рэж. І.М. Дабралюбава "Белые росы". "Беларусьфільм" | 1983 | 1 | 1 | |
| 30 | Фатаграфіі кадраў з мастацкага фільма рэж. І.М. Дабралюбава "Мама, я жив" з удзелам Э.М. Гарачага (у неўстаноўленай ролі), Ю.А. Кухаронка (у ролі камісара партызанскага атрада Дзмітрыя). Т.К. Макаравай (у ролі партызанкі Казіміраўны) і інш. і кінапроб. "Беларусьфільм" | 1985 | 5 | 5 | |
| | **2. ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ Э.М. ГАРАЧАМУ АД РОЗНЫХ АСОБ** | | | | |
| 31 | [Аўташаржы] Г.М. Гарбука, Т.А. Кокштыса, Я.П. Шабана. З подпісам Г.М. Гарбука і дароўнымі надпісамі Т.А. Кокштыса, Я.П. Шабана Э.М. Гарачаму.<br>Папера, аловак | [1954]-1960 | 4 | 4 | |
| 32 | Праграма спектакляў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Аптымістычная трагедыя", "Варвары" і інш.<br>З дароўнымі надпісамі і аўтографамі акцёраў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага А.Б. Абуховіч, А.І. Клімавай, Я.М. Палосіна і інш. Э.М. Гарачаму.<br>Брашура | 1958 | 23 | 1 | |
| 33 | Фатаграфіі П.Ф. Дубашынскага ў неўстаноўленых ролях, сыграных у тэатры імя Я. Купалы. З дароўнымі надпісамі П.Ф. Дубашынскага Э.М. Гарачаму ад 24.03.1970 г., 1972 г. | [1970, 1972] | 2 | 2 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ І ПРА Э.М. ГАРАЧАГА** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 34 | Праграма дыпломных спектакляў дзевятага выпуску акцёрскага факультэта БДТМІ "На дне", "Прымакі", "У порце" і інш. з удзелам Э.М. Гарачага. Прыкладзена інфармацыя пра спектакль "На дне" - выразка з газеты | 1958 | 6 | 2 | |
| 35 | Праграма Усесаюзнага агляду дыпломных спектакляў тэатральных ВНУ СССР "Африканская любовь", "Злой дух", "На дне" і інш. з удзелам Э.М. Гарачага | 1958 | 17 | 1 | |
| 36 | Праграмы спектакляў і буклет Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Алиса в стране Чудес", "Вяртанне ў Хатынь". "Макбет", "Трёхгрошовая опера" і інш. з удзелам Э.М. Гарачага.<br>Некаторыя з дароўнымі надпісамі Ю.М. Тура, Л.В. Былінскай, Л.П. Зайцавай і аўтографамі артыстаў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага | 1974-1977 | 31 | 7 | |
| 37 | Запрашэнне Дома мастацтваў і тэатра імя Я. Купалы на юбілейны вечар, прысвечаны 70-годдзю з дня нараджэння С.М. Станюты, на імя Э.М. Гарачага | 1958 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 38 | А.В. Сабалеўскі. "На пачатку вялікай дарогі". Рэцэнзія на дыпломныя спектаклі выпускнікоў БДТМІ "Прымакі", "У порце", "У Сібір" з упамінаннем Э.М. Гарачага.<br>Выразка з газеты | 1958 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 39 | Д.А. Арлоў. "Майстэрства сцэнічнага вобраза". Аглядная рэцэнзія на спектаклі мінскіх тэатраў.<br>Выразка з газеты | 1954 | 1 | 1 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| | **4.1. ФАТАГРАФІІ Э.М. ГАРАЧАГА, ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ І З ДЗЕЯЧАМІ КУЛЬТУРЫ** | | | | |
| 40 | Я.П. Шабан. Шарж Э.М. Гарачага ў неўстаноўленай ролі з спектакля БДТМІ "Клоп" У.У. Маякоўскага.<br>Папера, аловак | 1956 | 1 | 1 | |
| 41 | Невядомы аўтар. Партрэт Э.М. Гарачага. | [кан. 1950-х-1960-я | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Папера, аловак | гг.] | | | |
| | * * * | | | | |
| 42 | Фотапартрэты Э.М. Гарачага | [пач. 1960-х гг.], 1994 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 43 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага з студэнтамі БДТМІ Г.І. Волчакам, Л.Г. Бакштанавым, У.П. Бузуком, Г.М. Гарбуком, Р.С. Дубавым і інш. | 1954-[1958] | 6 | 6 | |
| 44 | Фатаграфія Э.М. Гарачага з М. Гаранцам, Т.А. Кокштысам, П.С. Малчанавым, А.Я. Фурманавай і інш. пасля дыпломнага спектакля выпускнікоў акцёрскага факультэта БДТМІ "Прымакі" Я. Купалы | 1958 | 1 | 1 | |
| 45 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага з Э.М. Зайцавай, Б.Л. Берцінгам, Л.С. Бельскай, Б.В. Барысёнкам, Л.К. Барташэвіч і інш. пасля спектакляў ТЮГа БССР: "За лясамі дрымучымі" А. Вольскага і П.М. Макаля, "Не верце цішыні" І.П. Шамякіна, "Сёстры" Ф. Кнорэ | 1958 | 3 | 3 | |
| 46 | Фатаграфія Э.М. Гарачага з Я.М. Палосіным у час выканання сцэны з спектакля "Оптимистическая трагедия" У.В. Вішнеўскага | [пач. 1970-х гг.] | 1 | 1 | |
| 47 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага з В.К. Галузам, Б.М. Падвам, А.К. Шышкіным у час творчай сустрэчы ўдзельнікаў спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Сказки старого Арбата" А.М. Арбузава з студэнтамі БДУ імя У.І. Леніна | 1972 | 2 | 2 | |
| 48 | Фатаграфія Э.М. Гарачага з А.І. Клімавай, В.І. Курганам, І.К. Лакштанавай, Б.І. Луцэнкам і інш. пасля спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Последняя инстанция" М.Я. Матукоўскага.<br>З аўтографамі І.К. Лакштанавай, М.Я. Матукоўскага, В.І. Кургана, А.І. Шах-Парон і інш. | 1974 | 1 | 1 | |
| 49 | Фатаграфія Э.М. Гарачага ў час накладвання грыму для ролі Дзянішчыка ў мастацкім фільме рэж. А.Я. Карпава "Его батальон". "Беларусьфільм" | 1988 | 1 | 1 | |
| 50 | Фатаграфіі Э.М. Гарачага з А.Х. Асіпенкам, Д.Л. Ніжнікоўскай і інш. пасля прэм'еры мастацкага фільма рэж. Д.Л. Ніжнікоўскай "Конец бабьего лета". "Беларусьфільм" | 1983 | 4 | 4 | |

### 4.2. ФАТАГРАФІІ АКЦЁРАЎ У РОЛЯХ І СЦЭНАХ З

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **СПЕКТАКЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМТЭАТРА БССР ІМЯ М. ГОРКАГА І ІНШ.** | | | | |
| 51 | Фатаграфіі Д.А. Арлова ў ролі Мальволіо ("Двеннадцатая ночь" У. Шэкспіра, рэж. С.Ф. Уладычанскі), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага. Фотакопіі | 1945 | 2 | 2 | |
| 52 | Фатаграфія сцэны з спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Что посеешь, то и пожнешь" ("Песня наших сердец") В. Палескага, пастаўленага рэж. Д.А. Арловым, з удзелам Д.А. Арлова (у ролі Чайкі), Г.А. Качаткова (у ролі Чарнухі), Г.К. Някрасава (у ролі Сакалова), І.А. Рожбы (у ролі Падгайскага) Фотакопія | 1950 | 1 | 1 | |
| 53 | Фатаграфіі В.М. Філатава ў ролі Івана Каламійцава ("Последние " М. Горкага, рэж. Б.І. Луцэнка, У.А. Маланкіна), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам В.М. Філатава, Л.У. Былінскай (у ролі Надзеі), Т. Хвосцікавай (у ролі Веры), Т.А. Яблакавай (у ролі Соф'і) | 1976 | 2 | 2 | |
| 54 | Фатаграфіі Л.І. Зайцавай у ролі Полі Пічэм ("Трёхгрошовая опера" Б. Брэхта, рэж. Б.І. Луцэнка), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам Л.І. Зайцавай, З.Г. Асмолавай (у ролі Люсі) | 1976 | 2 | 2 | |
| 55 | Фатаграфіі А. Івановай у ролі Зосі ("Пойти и не вернуться" паводле аповесці В.У. Быкава, рэж. Б.І. Луцэнка), сыгранай у Дзяржаўным рускім драмтэатры БССР імя М. Горкага, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам А. Івановай, П.П. Юрчанкі (у ролі Антона), У.І. Шэлестава (у ролі Петракова) | 1978 | 2 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 56 | Фатаграфія Г.І. Волчака, індывідуальная | 1982 | 1 | 1 | |
| 57 | Фатаграфія акцёраў Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага З.Г. Асмолавай і інш. у час гастроляў у Томску | 1983 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 58 | Фатаграфія кінапробы Г.М. Гарбука для мастацкага фільма "Конец бабьего лета" рэж. Д.Л. | 1982 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Ніжнікоўская. "Беларусьфільм" | | | | |
| | * * * | | | | |
| 59 | Т.А. Кокштыс. Партрэты Г.М. Гарбука, Г.С. Дубава, неўстаноўленай асобы.<br>Папера, туш, аловак, пастэль | [1958]-1960 | 3 | 3 | |
| 60 | Т.А. Кокштыс. Партрэт Г.С. Дубава ў ролі Пушкіна з неўстаноўленага спектакля. Эскіз.<br>Папера, аловак | [1958] | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 61 | Я.Г. Волкаў. Эскіз касцюма Вінаградава для спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "Объявление в вечерней газете" А. Паповай, пастаўленага рэж. М.М. Пінігіным. З віншавальным надпісам Я.Г. Волкава Э.М. Гарачаму ад 03.03.1982 г.<br>Папера, аловак | 1982 | 1 | 1 | |
| 62 | [Д. Бароўскі]. Эскіз дэкарацыі для спектакля Дзяржаўнага рускага драмтэатра БССР імя М. Горкага "А по утру они проснулись" паводле аповесці В.М. Шукшына, пастаўленага рэж. І.А. Райхельгаўзам.<br>Папера, аловак, шарыкавая ручка | 1983 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 62 (шэсцьдзесят два)

спраў з № 1 па № 62 , 172 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.